Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 55 (124) ПЯТНІЦА 8 САКАВІКА 1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ МІЖНАРОДНЫ КОМУНІСТЫЧНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

МІЖНАРОДНЫ КОМУНІСТЫЧНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

Сёння ва ўсіх краінах свету працоўныя жанчыны будуць святкаваць дзень міжнароднай салідарнасці. 30 год прайшло з таго часу, калі міжнародная канферэнцыя жанчын-соцыялістак у Капенгагене па прапанове вядомай рэволюцыянеркі Клары Цэткін прыняла рашэнне аб штогоднім святкаванні Міжнароднага дня работніц ва ўсіх краінах.

У гэты дзень працоўныя жанчыны Совецкага Саюза з гордасцю падвядуць вынікі сусветна-гістарычных перамог, дасягнутых пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі. Жанчына ў СССР з'яўляецца актыўным будаўніком комуністычнага грамадства. Яна рука аб руку, плячо ў плячо са сваімі братамі, з усім совецкім народам змагаецца за росквіт сваёй радзімы, бацькаўшчыны працоўных і прыгнечаных народаў усяго свету.

Жанчына ў СССР мае роўныя правы з мужчынам на працу. Лік жанчын, занятых ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, складае 10,5 мільёна чалавек. Калі ва ўсіх капіталістычных краінах жанчына мае права працаваць у якасці служанкі, кельнершы, падзёншчыцы-батрачкі, то ў Совецкім Саюзе работніцы складаюць 24,5 процанта агульнага ліку рабочых каменна-вугальнай прамысловасці, 31 процант у металургічнай прамысловасці, 64 проц. у бавоўнянай прамысловасці.

Наперакор усялякім «тэорыям» жанчыны ў СССР працуюць на транспарце ў якасці машыністаў, іх памочнікаў, начальнікаў станцый. Зінаіда Троіцкая — гэта першая жанчына ва ўсім свеце, працуючая ў якасці начальніка чыгункі.

Асабліва прыгнечанай і забітай астаецца жанчына-сялянка ў краінах капітала. Толькі ў СССР жанчына-калгасніца нароўні з мужчынам удзельнічае ў калгаснай працы, маючы сваю працоўную кніжку і свае працадні. Гэта з'яўляецца асновай яе эканамічнай незалежнасці, а значыць і яе сапраўдным вызваленнем. Звыш 19 мільёнаў сялянак удзельнічае ў калгасных работах. Жанчыны працуюць старшынямі калгасаў, трактарыстамі, камбайнерамі, аграномамі.

Жанчына ў СССР нароўні з мужчынам мае права выбіраць і быць выбранай у вярхоўныя органы ўлады. Буржуазныя канстытуцыі ўсяляк ушчамляюць гэтыя правы жанчын. Для жанчын устанаўліваюцца асобныя ўзросныя і адукацыйныя цэнзы. Жанчыну ўсялякімі законамі і беззаконнасцямі не дапушчалі і не дапушчаюць у парламент. Толькі ў СССР жанчына-дэпутат, жанчына-дзяржаўны дзеяч стала звычайнай з'явай. У Вярхоўны Совет СССР выбрана 189 жанчын, у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік — 848 дэпутатаў жанчын, у мясцовыя советы — звыш 400 тысяч. Гэтыя найвялікшыя правы зараз прадастаўлены і вызваленым жанчынам заходніх абласцей УССР і БССР. Працоўныя нашай вобласці вылучылі многіх жанчын кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, як, напрыклад, работніц Марыю Дз'ячук і Марыю Пятроўскую, сялянак Еўдакію Максімлюк, Ольгу Мазалеўскую, Веру Камароўскую і многіх іншых.

Партыя і ўрад стварылі ўмовы для працоўных жанчын, для ўдзелу ў вытворчым і грамадскім жыцці краіны. Грамадскія сталовыя, дзіцячыя сады і яслі, раскінутыя шырокай сеткай у гарадах і вёсках, на справе вызваляюць жанчыну ад цяжкай хатняй работы, ствараюць умовы для сапраўднай роўнасці з мужчынам.

Выключна вялікія клопаты праяўляюць партыя і ўрад аб здароўі жанчыны, аб мацеры і дзіцяці. У царскай Расіі было ўсяго 7 тысяч коек у радзільных дамах, а ў 1938 годзе колькасць радзільных коек у СССР павялічылася да 135 тысяч. Вялікімі клопатамі акружана многасямейная маці. З дня выдання закона аб дзяржаўнай дапамозе многасямейным з чэрвеня 1936 года па 1-е снежня 1939 года многасямейныя маці атрымалі дзяржаўнай дапамогі 3.184 мільёны рублёў. Гэта адбілася на павышэнні нараджаемасці і памяншэнні смяротнасці дзяцей. На кожную тысячу чалавек насельніцтва ў СССР у 1938 годзе нарадзілася дзяцей 38,3, а ў Англіі — 15,3, ва Францыі — 14,7. Павелічэнне колькасці народжаных над лікам памёршых складае ў СССР у чатыры разы больш, чым у ЗША, у тры разы больш чым у Англіі.

Жанчына ў СССР з'яўляецца палкай патрыёткай сваёй радзімы. У нас ёсць жанчыны героі Совецкага Саюза, жанчыны, якія працуюць у радах доблеснай Чырвонай Арміі і абараняюць сваю радзіму. Многа жанчын праявілі сябе ў баях з фінскімі бандамі і ўдастоіліся ўзнагароды ўрада. Колькі хвалюючых пісем пасылаюць жонкі сваім мужам, мацеры сваім сынам, якія змагаюцца за вызваленне фінскага народа. Мацеры і жонкі натхняюць сваіх дзяцей і мужоў на разгром азвярэлых фінскіх банд.

Англійскія і французскія імперыялісты распалілі пажар другой імперыялістычнай вайны. Гэта яшчэ больш пагоршыла становішча працоўных жанчын капіталістычных краін. Сем'і мабілізаваных кінуты на галоднае і жабрацкае жыццё. Працоўныя жанчыны ўзнімаюць свой голас пратэсту супроць грабежніцкай вайны. Яны сёння будуць дэманстраваць за мір, за свабоду, за салідарнасць з вялікім Совецкім Саюзам.

Працоўныя жанчыны заходніх абласцей атрымалі аднолькавыя правы, якія маюць жанчыны ў СССР. У прадстаячых выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР жанчыны заходніх абласцей пакажуць сябе дастойнымі дочкамі сваёй радзімы, яны будуць аднадушна галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Яны будуць галасаваць за росквіт, за шчасце сваёй краіны, яны будуць галасаваць за партыю Леніна—Сталіна, за свайго вызваліцеля вялікага, любімага Сталіна.

—«о»—

УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАДАВЫХ РАБОТНІЦ

У азнаменаванне Міжнароднага комуністычнага жаночага дня Нарком электрастанцый і электрапрамысловасці СССР тав. Первухін узнагародзіў звыш 200 перадавых работніц і жонак — грамадскіх работніц значком «Отличник социалистического соревнования Наркомэлектро» і пахвальным лістом Наркамата.

Нарком чорнай металургіі тав. Меркулаў узнагародзіў значком «Отличник социалистического соревнования черной металлургии» і пахвальным лістом Наркамата каля 150 лепшых работніц. Пахвальным лістом Наркамата ўзнагароджана 16 жонак—грамадскіх работніц. 28 жонкам—грамадскім работніцам аб'яўлена падзяка.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб вызваленні ад асноўнай работы старшынь ці сакратароў акруговых і ўчастковых выбарчых камісій па выбарах у Вярхоўны Совет СССР ад заходніх абласцей Украінскай ССР і Беларускай ССР.

Устанавіць, што старшыні ці сакратары акруговых і ўчастковых выбарчых камісій па выбарах у Вярхоўны Совет СССР ад заходніх абласцей Украінскай ССР і Беларускай ССР з 10 сакавіка да 25 сакавіка 1940 года вызваляюцца ад сваёй асноўнай работы з захаваннем аплаты па месцу пастаяннай работы.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
7 сакавіка 1940 г.

АПЕРЗВОДКІ ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 5 сакавіка на Карэльскім перашыйку ў раёне Выбаргскага заліва нашы часці занялі востраў Раван-Саары з горадам Равансаары і востраў Суоніон-Саары. На паўночны ўсход ад Выбарга занята мястэчка Неецеля у адным кілометры на поўдзень ад станцыі Нарысалмі на чыгунцы Выбарг — Сердобаль.

На астатніх участках фронта нічога істотнага не адбылося.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіт 21 самалёт праціўніка.

*

На працягу 6 сакавіка на фронце не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 3 самалёты праціўніка.

Балгарскі друк аб перамогах Чырвонай Арміі ў Фінляндыі

Балгарскі друк удзяляе вялікую ўвагу поспехам Чырвонай Арміі ў Фінляндыі. Газета „Зара" указвае, што за апошні час павялічыліся выпадкі далучэння фінскіх падраздзяленняў да часцей Чырвонай Арміі. Газета падкрэслівае, што фінскія войскі знаходзяцца ў становішчы расстройства і заняпаду.

Змяшчаючы абвяржэнне штаба Ленінградскай Ваеннай Акругі на так званую „ноту" белафінскага „ўрада" Лізе Нацый, балгарскі друк асабліва падкрэслівае, што Чырвоная Армія лічыць прымяненне тазаў антымаралным учынкам, які падлягае ўсеагульнаму асуджэнню. Газеты ўказваюць пры гэтым, што совецкая авіяцыя не бамбардзіравала грамадзянскага насельніцтва і што лінія Манергейма прарвана совецкімі часцямі ў найбольш важных пунктах.

Газета „Борьба" піша, што ўпартасць і шаленае супраціўленне Фінляндыі выгадна толькі Англіі і Францыі, якія ўзброілі і ўзбройваюць белафінаў.

(ТАСС).



КОММУНАРКА

Луч света
Из темного царства,
Иконы
И кнут над столом —
Так правили государством
Хозяева жизни в былом.
Ткачиха, кормилица, прачка,
Работница,
Женщина-мать, —
Кормились
Законной подачкой,
Не смея о лучшем мечтать.
Ты двинулась в каторги,
В ссылки,
Ты жребий борца приняла —
Тебе говорили с ухмылкой:
„Ты женщиной только была".
...Долой это темное царство,
Икону
И кнут над столом!
Садись управлять государством,
Есть место тебе
За рулем!
Теплушки. Подполье. Разведки.
Бараки.
Тифозные вши.
Ход нэпа. Бои пятилетки.
Победы. Ученье в глуши.
Ты в самое пекло
Ввязалась,
Ты в самое
Пламя вошла.
Ты целому миру сказала:
„Не женщиной только была".
Боец, командир, академик,
Учитель, профессор, судья.
Ты всюду проходишь,
Как время —
В нем
Равная доля твоя.
Неслышно,
Как молния, пестро
Пора боевая прошла.
Шумят
Твои младшие сестры:
„Она коммунаркой была".
Луч света
Из темного царства —
Чадящий огарок — в былом.
Мы правим с тобой
Государством
В четыре руки
За рулем!

Мих. Голодный.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

НА РЫБНЫЯ ЗАВОДЫ ДАЛЁКАГА ЎСХОДА

Кіеў. Днямі з Харкаўскай вобласці на Далёкі Ўсход выехалі 218 комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Яны будуць працаваць на крабакансервавых заводах.

Моладзь з велізарным жаданнем едзе на рыбныя промыслы. Хутка з Кіеўскай, Палтаўскай, Сумскай і Чэрнігаўскай абласцей ад'язджае на рыбныя промыслы і рыбакансервавыя заводы Далёкага Ўсхода група моладзі больш 1000 чалавек.

ВЫРАБЫ З АСАКІ

Владзівасток. Ва Усурыйскай вобласці ў раёне возера Ханка ёсць велізарная забалочаная нізіна. Плошча ў 40.000 гектараў усюды пакрыта асакой, непрыгоднай на корм жывёле.

Мясцовыя шукальнікі новай сыравіны даказалі, што асака можа быць з вялікай карысцю выкарыстана. Яна, напрыклад, дае моцнае валакно, прыгоднае для тэхнічных вырабаў. У краявым музеі паявіліся многалікія вырабы з асакі: канаты, вяроўкі, мешкавіна, золатапрамывачны мат, пакулле і нават каўровая дарожка.

Старшыня Прымортскага краявога саюза прамысловай кааперацыі тав. Молакаў у гутарцы з карэспандэнтам «Праўды» паведаміў, што промарцель імені XVIII партыйнага з'езда прыступіла да апрацоўкі асакі, пачата ўжо вытворчасць матаў. У гэтым годзе ў сяле Александраўцы будзе пабудавана фабрыка па выпрацоўцы з асакі тэкстыльнага валакна. На будаўніцтва фабрыкі асігнавана 280 тысяч рублёў.



Калгас ім. Сталіна (Крымская АССР) атрымаў на сельска-гаспадарчай выстаўцы ў 1939 годзе дыплом 1-ай ступені, прэмію — легкавую машыну і 10.000 рублёў грашыма. У 1939 годзе даход калгаса складае 1.012.000 рублёў.

На здымку: калгаснікі звяраюць свае рахункі. (Фота-клішэ ТАСС).

НОВЫЯ СЕЛЬСКІЯ МАГАЗІНЫ

Хабараўск. У сяле Амурзет, рабочым пасёлку Смідовіч (Яўрэйская аўтаномная вобласць), у Бакінскім і Хінгана - Архарынскім раёнах Хабараўскага края, пачалося будаўніцтва універмагаў. Усяго у гэтым годзе ў краі будзе адкрыта звыш 100 раённых сельскіх універмагаў і крам.

15.600 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ НА АЗДАРАЎЛЕНЧЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

Іванава. На аздараўленчыя мерапрыемствы ў прошлым годзе ЦК саюза рабочых бавоўнянай прамысловасці Іванаўскай вобласці выдаткаваў больш 12.600 тысяч рублёў. У гэтым годзе для гэтага выдзяляецца 15.600 тысяч рублёў.

ПАДРЫХТОЎКА ДА НАВІГАЦЫІ

Архангельск. Ва ўсіх затонах ідзе падрыхтоўка да прадстаячай навігацыі, адкрыццё якой чакаецца ў першых чыслах мая. План сударамонту па Паўночнаму рачному параходству да 1 сакавіка выканан на 69 процантаў.

УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПЛАНЕРЫСТАЎ

Цікавым і захапляючым будзе сезон у гэтым годзе ў спартсменаў-планерыстаў.

У канцы мая Цэнтральны Совет Асоавіяхіма СССР правядзе з аэрадрома ў Астаф'еве пятнацатыя ўсесаюзныя спаборніцтвы планерыстаў.

У спаборніцтвах прымуць удзел 30 каманд — Масквы, Ленінграда, Кіева, Баку і іншых гарадоў Совецкага Саюза. Сярод удзельнікаў лепшыя майстры планернага спорту — Анохін, Карташоў, Саўцоў, Раманаў, Клепікава, Зелянкова і інш.

У праграме спаборніцтваў: палёты на дальнасць са зваротам на старт, на дальнасць у раней намечаны пункт, палёты на вышыню, а таксама гонкі на 50 і 100 кіламетраў.

Планерысты, заваяваўшыя першыя месцы, будуць вылучаны кандыдатамі на скарасныя планерныя гонкі па маршруту Масква - Харкаў - Масква, з прамежкавымі, але не абавязковымі пасадкамі ў Туле, Орле і Курску. Такія гонкі на планерах у Совецкім Саюзе праводзяцца ўпершыню.

СВАІХ ЛЕПШЫХ ДОЧАК, РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК, НАРОД ВЫЛУЧЫЎ КАНДЫДАТАМІ Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 352 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Марыя Канстанцінаўна Пятроўская

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)



У кабінеце дырэктара беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 1 увайшла жанчына сярэдніх год. Гэта была прадзільшчыца Марыя Канстанцінаўна Пятроўская.

На [illegible] ласток Чырвонай Арміі, Пятроўская адна з першых работніц узначаліла барацьбу за працоўную дысцыпліну.

Цяпер працуем не на Фукса, а на саміх сябе, — часта заяўляла яна спазніўшымся на работу. — Цяпер гэта фабрыка наша, мы самі гаспадары.

Пятроўская стала ініцыятарам барацьбы за працоўную дысцыпліну, за ўшчыльненне рабочага дня, за паляпшэнне якасці прадукцыі і гэта стварыла ёй аўтарытэт сярод работніц.

Яе выбралі членам фабрычнага камітэта. Пятроўская ўзначаліла камісію па арганізацыі на фабрыцы дзіцячых ясляў. І вось зараз яна прышла да дырэктара камбіната.

— Я хачу параіцца, як зрабіць, каб усе работніцы, усе жыхары Беластока ведалі, што дала нам совецкая ўлада за гэты кароткі тэрмін. Вось я напісала аб гэтым у газету. Я хачу расказаць што ў нас цяпер ёсць медыцынскі пункт, дзіцячыя яслі. [illegible] работніцы арганізавалі харавы гурток. Хачу расказаць аб тым, як мы зажылі па новаму...

— Добра, — сказаў дырэктар. — Тут і раіцца няма чаго. Тое, што напісала, — пашлі ў рэдакцыю, а акрамя таго, табе прыдзецца сёння расказаць аб гэтым на мітынгу. Сёння ў нас мітынг, прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі.

Пятроўская, сустрэўшы падтрыманне дырэктара, усміхнулася...

— Расказаць, безумоўна, трэба, але я-ж не ўмею гаварыць перад народам. Я ніколі не выступала на сходах, — адказала яна.

Праз пару гадзін у двары тэкстыльнага камбіната перад [illegible]тысячнай аўдыторыяй выступала Пятроўская. Яна расказала аб тым, што дала вызваленаму народу Сталінская Канстытуцыя, якія змены адбыліся ў жыцці тэкстыльшчыкаў Беластока.

Пятроўскую ведаюць маці-работніцы, якія стварылі разам з ёй дзіцячыя яслі і дзіцячыя сады. Пятроўскую ведаюць дзеці тэкстыльшчыкаў, якія упершыню ў сваім жыцці пабывалі на ёлцы, арганізаванай Марыяй Канстанцінаўнай па даручэнню фабрычнага камітэта. Пятроўскую ведаюць на выбарчым участку, як выдатнага агітатара. Пятроўскую ведаюць усе тэкстыльшчыкі першага камбіната. За гэтыя месяцы яна вырасла на іх вачах.

15 лютага тэкстыльшчыкі аказалі ёй вялікае давер'е і вылучылі Марыю Канстанцінаўну кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

* * *

З ранняга дзяцінства Пятроўская пазнала, што такое нужда і лішэнні. Яе бацька 45 год працаваў на тэкстыльных фабрыках. 25 год працавала прадзільшчыцай маці Пятроўскай. У сям'і было 7 дзяцей. Жылі бедна, ніколі не растаючыся з нуждой. Марыя Канстанцінаўна зусім маленькай дзяўчынкай стала няньчыць сваіх сясцёр і братоў. З раніцы да позняй ночы бацькі працавалі на фабрыцы, і маленькая дзяўчынка была дома за гаспадыню і за няньку.

Пачалася імперыялістычная вайна. Сям'я Пятроўскай разам з бежанцамі паехала у Расію ў гор. Новамаскоўск, Екацярынаслаўскай губерні. Дзяўчынку аддалі «у людзі». Работы было вельмі многа.

— Колькі вады трэба было перанасіць, колькі падлог перамыць, колькі пакояў убраць, — успамінае Марыя Канстанцінаўна. Я-ж была зусім маленькай, слабай дзяўчынкай. Часта галадала. Папрасіць есці баялася, а гаспадары забываліся аб тым, што я галодная. Каму патрэбна чужое дзіця?

У 1918 годзе сям'я Пятроўскіх вярнулася зноў у сяло Бацечкі. Марыя Канстанцінаўна пайшла працаваць да памешчыка Добкі. На работу будзілі рана, калі толькі пачне світаць і падзьме халодны ветрык. Уставаць не хацелася, нылі рукі, балелі плечы, хацелася спаць.

— Перад работай паілі нас перагонам з-пад сепаратара, — расказвае тав. Пятроўская. — «Сапраўднага малака не заслугоўваеце», — гаварылі нам.

Вярталіся з работы пасля заходу сонца. Часам пані прыходзіла палюбавацца на чужую працу. Яна стаяла, высока падняўшы галаву, апранутая ў якое-небудзь светлае шыкарнае плацце, працягваючы руку ў белай лайкавай пярчатцы для цалавання.

— Як прыкра было глядзець на усё гэта, закіпала ўнутры. Аднойчы нас прымусілі капаць мерзлую бульбу. А калі мы закончылі гэту работу, нам заплацілі гэтай-жа мерзлай, непрыгоднай для ежы бульбай. Прывезлі яе дамоў, рассыпалі на падлозе, яна адышла, размякла, стварыўшы брудную, смярдзючую лужыну.

Доўга працавала Марыя Канстанцінаўна з мужам у дробных фабрыкантаў. У 1931 годзе у яе памер муж. Засталося двое маленькіх дзяцей.

Што рабіць?

Гэта цяжкае пытанне трэба было вырашыць, трэба было не губляць прысутнасці духу, клапаціцца самой аб усім, выхоўваць дзяцей, зарабляць грошы. Увесь цяжар, усе клопаты навальліся на бедную жанчыну.

Зімой у мароз хадзіла яна ў лес за дрывамі, цягала іх на сабе.

У скорасці яшчэ адно гора навалілася на плечы беднай жанчыны. Дзяўчынка, яе маленькая Ірына, захварэла. У яе было штосьці сур'ёзнае в вухах. Паднялася тэмпература. Шыя, твар распухлі. Патрэбна была тэрміновая аперацыя: іначай дзіцяці пагражала смерць. Але зноў паўстала пытанне, што рабіць. Што рабіць чалавеку, у якога няма грошай і дастаць іх няма дзе? Думаць аб медыцынскай дапамозе, не маючы грошай, бескарысна.

Стаў падрастаць сын. Марыі Канстанцінаўне хацелася аддаць хлопчыка ў рамесніцкую школу. Зноў вырасла непераадольная перашкода— дзе ўзяць 300 злотых за навучанне? Прышлося ад гэтай думкі адмовіцца.

— Многа цяжкіх год прышлося перажыць мне, — гаворыць Марыя Канстанцінаўна. — Але цяпер усё гэта мінула, мінула беспаваротна і ўспамінаць аб гэтым не хочацца.

Пятроўская ўмела пратэставаць, смела шукала праўды. Аднойчы быў такі выпадак: збіралі грошы на ўмацаванне абароны Польшчы. Хадзілі па цэхах з падпісным лістом. Яна не хацела афяраваць на абарону дзяржавы, якая прыгнятала працоўных. Да яе прыходзілі некалькі разоў. Гэта звярнула на сябе ўвагу і ёй пагражалі звальненнем.

— Не дам, ні капейкі не дам! Не буду ў сваіх дзяцей адбіраць апошні кавалак хлеба. Калі хочаце выгнаць — выганяйце, я ад свайго рашэння не адступлю. Яе прыкладу паследавалі амаль увесь цэх.

Працавала Пятроўская ў Муркеса. Там рабочы дзень працягваўся 10 і 11 гадзін. Марыя Канстанцінаўна пачала пратэставаць першая. Адпрацаваўшы 8 гадзін, яна часта кідала станок, выцірала рукі і ішла дамоў.

З дапамогай Чырвонай Арміі рабочы клас заходніх абласцей БССР вызвален назаўсёды. Няма цяпер фуксаў і іншых міраедаў. Новым жыццём зажылі працоўныя Беластока і новым жыццём зажыла Марыя Канстанцінаўна Пятроўская.

Галасуйце за тав. Пятроўскую — прадстаўніка блока комуністаў і беспартыйных!

Н. Бражнікава

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 349 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Еўдакія Фёдараўна Максімлюк

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)



Еўдакію Фёдараўну Максімлюк больш, чым каго-б там ні было, можна залічыць у разрад людзей, якія жылі марай аб краіне соцыялізма. Еўдакія Фёдараўна да 1922 года жыла ў Совецкім Саюзе, у далёкай Сібіры, у горадзе Томску. Дачка беднага вартаўніка чыгункі, яна ў 1919 годзе вышла замуж за бежанца—беларуса. Не паспела Еўдакія Фёдараўна прыбыць з мужам у панскую Польшчу і пасяліцца ў вёсцы Новая Воля, Заблудаўскага раёна, як была адразу-ж арыштавана польскай паліцыяй. «Ты зусім не жонка Максімлюку, ты проста падасланая з Совецкага Саюза комуністка», — заявілі ашарашанай жанчыне ў паліцыі. І тым самым наштурхнулі гэту простую і скромную жанчыну на думку: «Паны баяцца комуністаў, значыць комуністы стаяць за працоўны народ».

З першага-ж дня прыезду ў панскую Польшчу прышлося пайсці батрачыць к памешчыкам Еўдакія Фёдараўна, усе 17 год жыцця ў Польшчы працавала на памешчыка Александра Рама. Капала бульбу на яго палях, сячэ дзіла маладых лес на его абшарах. Муж таксама працаваў на памешчыка Рама.

Так працякала бязрадаснае, паўгалоднае жыццё. Але ні Еўдакія Фёдараўна, ні яе муж ні на мінуту не забывалі, што дзесьці побач, у краіне Советаў,—другі свет, другое жыццё, вольна дыхаецца і лепш жывецца сялянам.

Праз 5 год пасля пераезду ў панскую Польшчу Еўдакія Фёдараўна ўступае ў «Таварыства беларускай школы». Зрэдку ў рукі Максімлюк пападала якая-небудзь нелегальная кніжка аб калгасах, аб жыцці совецкага сялянства. І тады доўга ўпоўгаласа гаварыла яна з мужам аб неабходнасці змагацца за лепшае жыццё і праклінала сваю няшчасліваю батрацкую долю.

Не дзіўна таму, што як толькі прыбыла Чырвоная Армія, муж Еўдакіі стаў старшынёй сялянскага камітэта вёскі, а Еўдакія Фёдараўна, забітая нуждой батрачка, якая раней не смела двух слоў сказаць, выступала цяпер на мітынгах перад тысячамі людзей. Затым Еўдакія Фёдараўна арганізавала ў сваёй вёсцы кааператыў і была першым яго прыказчыкам да таго часу, пакуль яе не паслалі вучыцца на месячныя курсы совецкіх работнікаў.

У студзені 1940 года Еўдакія Фёдараўна вярнулася з курсаў. Аднавяскоўцы прышлі да яе і засыпалі пытаннямі — усіх цікавіла пытанне аб калгасах. Еўдакія Фёдараўна прачытала ім «Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі». Адразу-ж 36 жыхароў Новай Волі рашылі арганізаваць калгас імені Сталіна. Яшчэ праз некаторы час у гэтым калгасе стала ўжо 120 членаў. Старшынёй калгаса выбралі Еўдакію Фёдараўну Максімлюк.

Для былой батрачкі настaлі гарачыя дні. 1250 га памешчыцкай зямлі і 1500 га сялянскай. Жыта і авёс на насенне і на корм жывёле звозяцца ў свірны. Робіцца вопіс жывога і мёртвага інвентара, рамантуецца збруя. Арганізаваны курсы для непісьменных і малапісьменных. Колькі спраў! І за ўсё адказвае Еўдакія Фёдараўна.

Прыклад вёскі Новая Воля узбударажыў усю акругу. Куды-б ні прыехала Максімлюк, яе засыпаюць пытаннямі аб калгасным будаўніцтве.

* * *

Еўдакія Фёдараўна едзе да выбаршчыкаў вёскі Трэсцяны. Прасторныя беларускія сані на чатырох кароткіх палазах на вольна цягне добра адкормлены калгасны конь. Твар у Еўдакіі Фёдараўны зрэзан маршчынамі, але вочы блішчаць яшчэ задорна і молада. Жанчыне можна даць і 30 і 50. На ёй паліто з белага даматканага сукна, аторочанае цялячай скурай.

Еўдакія Фёдараўна сядзіць у санях, моцна прыціскаючы да грудзей новенькі чорны партфель, у якім знаходзіцца толькі адна брашура — «Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі».

У вёсцы Трэсцяны яшчэ да пачатку схода, калі кандыдат у дэпутаты абаграваўся на кватэры настаўніка, у маленькі пакойчык набілася многа народу. Гэта былі галоўным чынам жанчыны і старыкі.

— Як арганізаваць калгас?

— Хто мае права ўступіць у калгас?

— Ці прышлюць калгасу трактары?

— Ці можа ўвайсці ў калгас беззямельны?

— У мяне 5 кароў — ці магу я ўступіць у калгас?

— Што такое працадзень?

Еўдакія Фёдараўна дастае сваю брашуру і, баючыся набытаць, адказвае на кожнае пытанне, чытаючы па брашуры. Яе слухаюць, затаіўшы дыханне. Адзін з старыкоў, апрануты ў кажух, прысеў ад хвалявання, другі, што скручваў цыгарку, перастаў рухаць пальцамі і так застыў у нямой позе.

Праз гадзіну ў школе адкрыўся сход. У невялікім класе сабралася звыш 400 чалавек. Сталі плячо ў плячо, баючыся кашлянуць. Сход адкрыў старшыня сялянскага камітэта, — хмуры, нечым нездаволены чалавек. Калі кандыдат у дэпутаты расказаў аб сваім жыцці, з зала зноў, як на кватэры настаўніка, пасыпаліся пытанні. Адчувалася, што сход хтосьці нябачна раскалоў на два лагеры. У адных пытаннях (такіх было большасць) гучала радасць, нецярпенне, гарачая цікаўнасць, у другіх — толькі цяжкая трывога і заклапочанасць. Да другіх адносіўся і сам старшыня.

— У мяне, — сказаў ён, — 6 кароў, чацвёра коней. А ў другога нічога. Як-жа гэта я з еднаюся з ім?

Хтосьці малады крычыць з зала:

— Не хочаш, не трэба! Сілай цябе ніхто не прымусіць. Абыйдземся!

У зале, дзе толькі што панавала цішыня, нарастае шум. Усе раптам пачынаюць гаварыць, спрачацца.

Кандыдат у дэпутаты падымаецца з свайго месца:

— Таварышы сяляне, калі вы хочаце арганізаваць калгас, то не рабіце гэтага згарача, абдумайце ўсе, як належыць. Спяшацца няма чаго. Вось я бачу, што на сходзе мала жанчын. Пайдзіце дамоў, парайцеся з жонкамі, — яны таксама голас маюць, — а потым вырашайце: быць у вас калгасу ці не быць.

Сяляне павольна разыходзяцца. У школе яшчэ доўга чуваць гоман і шум.

І праз некалькі дзён у Заблудаве на нарадзе старшынь участковых выбарчых камісій да Еўдакіі Фёдараўны падышло два чалавекі:

— Мы з вёскі Трэсцяны. Усе абдумалі і нават з жонкамі параіліся. Без калгаса нам, беднякам, не пражыць. Але старшыня сялянскага камітэта — памятаеце, каторы ўсё пра сваіх кароў непакоіўся, — не хоча прыняць нашых заяў. Спачатку адмовіўся таму, што напісаны яны простым алоўкам, а калі напісалі хімічным, ён заявіў, што не пакінулі месца для рэзалюцыі. Але зараз у нас ужо чарнілам напісана, як належыць. У наш калгас запісалася 25 сем'яў. Дзе тут нам зарэгістравацца?

* * *

Еўдакія Фёдараўна Максімлюк, былая яшчэ так нядаўна простай батрачкай, ужо вырасла у відната калгаснага арганізатара. Яна будзе верным абаронцам сялянскіх інтарэсаў у совецкім парламенце.

І. Паўлаў.

ЖАНЧЫНА ў СССР

(ЛІЧБЫ і ФАКТЫ)

«Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай ва ўсіх абласцях гаспадарчага, дзяржаўнага культурнага і грамадска-палітычнага жыцця» (артыкул 122-і Сталінскай Канстытуцыі).

—о—

Жанчыны СССР прымаюць дзейны ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці краіны.

Лепшыя з лепшых работніц, калгасніц і інтэлігентак, на справе даказаўшыя сваю адданасць соцыялістычнай радзіме, выбраны ў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады.

Сярод дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР — 189 жанчын. У Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік выбрана 848 жанчын, у Вярхоўныя Советы аўтаномных рэспублік — 588 жанчын-дэпутатаў.

У мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных па ўсяму Совецкаму Саюзу выбрана 422.279 жанчын, гэта значыць амаль трэцяя частка ўсіх дэпутатаў.

—о—

Жанчыны складаюць 52 процанты ўсяго насельніцтва СССР. Колькасць работніц і жанчын — служачых дасягае 9,4 мільёна, гэта значыць звыш адной трэці ўсіх рабочых і служачых СССР. Каля 20 мільёнаў жанчын працуюць у калгасах.

Такім чынам, у грамадскую працу па СССР уцягнута амаль 30 мільёнаў жанчын.

—о—

У СССР жаночая праца, аплачваемая таксама як і мужчынская, прымяняецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Жанчыны авалодваюць самымі разнастайнымі, раней недаступнымі ім галінамі працы, самымі складанымі прафесіямі.

—о—

У царскай Расіі 80 процантаў усіх працаваўшых жанчын складалі служанкі, падзёншчыцы і батрачкі. У СССР сярод усіх працуючых жанчын каля 2 процантаў дамашніх работніц. Астатнія заняты ў прамысловасці, на будаўніцтве, транспарце, у гандлі, у розных установах і арганізацыях.

Увесь Саюз ведае дэпутатаў Вярхоўнага Совета: ткачыху Еўдакію Вінаградаву, калгасніцу Марыю Дзямчэнка, трактарыстак Праскоўю Ангеліну, Праскоўю Каварднак і іншых перадавых жанчын Совецкай краіны.

—о—

У мінулым годзе паявіліся першыя жанчыны-металургі — падручныя сталевара Тацяна Інадітава (Магнітагорск) і Ларыса Феакціставана (Днепрапятроўск). Іх прыкладу следуюць іншыя. На многіх заводах паявіліся жанчыны-кавалі.

На чыгуначным транспарце СССР у розных пасадах — ад слесара да начальніка станцыі — працуе паўмільёна жанчын. Яны добра спраўляюцца з прафесіяй машыністак і іх памочнікаў, даглядчыкаў вагонаў, дзяжурных па станцыі і г. д.

ЖАНЧЫНЫ НА ЧЫГУНЦЫ

На чыгунках панскай Польшчы ніколі не працавалі жанчыны. Толькі пасля вызвалення заходніх абласцей Беларусі жанчыны атрымалі доступ на чыгунку.

За кароткі тэрмін на чыгунках заходніх абласцей утварыліся карэнныя змены. На 1 лютага на чыгунцы працуе 1.651 жанчына. Сярод іх пяць дзяжурных па станцыі, 327 праваднікоў, 8 стрэлачніц, 3 слесары і т. д. На курсы НКШЗ у Маскву, Гомель, Днепрапятроўск і іншыя гарады для падрыхтоўкі спецыялістаў паслана 47 чалавек. Курсы дарожнага аддзялення ўжо выпусцілі 81 чалавек і абучаюць яшчэ 200 жанчын.

Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка жанчыны чыгуначніцы сустракаюць новымі дасягненнямі. Адкрываюцца новыя курсы на 885 чалавек. Яны будуць рыхтаваць памочнікаў машыністаў, дзяжурных па станцыі, вагонных майстраў, вагаўшчыкоў, стрэлачнікаў і іншых спецыялістаў.

Вызваленыя жанчыны актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. Каля 100 чыгуначніц працуюць членамі акруговых і участковых выбарчых камісій, даверанымі, агітатарамі і т. д. 920 чыгуначніц вывучаюць у гуртках Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон.

Па ініцыятыве жанчын Беластоцкага чыгуначнага вузла пачаўся знамянальны рух па навядзенню ўзорнага парадку на чыгуначных станцыях, раз'ездах, інтэрнатах паяўных брыгад, чырвоных кутках. Жаночымі рукамі наводзіцца чыстата на чыгунцы.

Жонкі чыгуначнікаў і жанчыны актыву ст. Чарэмха па сваёй ініцыятыве ачысцілі ад снегу 2 тысячы квадратовых метраў чыгункі ў часы зімовых заносаў. 52 хатнія гаспадыні вывучаюць правілы тэхнічнай эксплаатацыі на чыгунцы, каб у выпадку неабходнасці пайсці на транспарт і замяніць мужчын.

8 сакавіка—першае жаночае свята ў заходніх абласцях Беларусі. Па-новаму сустракаюць вызваленыя жанчыны гэты дзень.

Н. Б.

ТКАЧЫХІ

Да прыходу Чырвонай Арміі палову рабочых тэкстыльнай прамысловасці Беластока складалі жанчыны. Яны працавалі матальшчыцамі, снавальшчыцамі, штопальшчыцамі і г. д. Але сярод іх амаль не было ткачых. На суконных фабрыках Беластока было толькі дзве ткачыхі і тыя заўседы знаходзіліся пад пагрозай звальнення. Ды яшчэ пяць ткачых працавала на плюшавай фабрыцы б. Бекера.

Існавала думка, што ткацкая работа з'яўляецца цяжкай для жанчыны. У той жа час на больш цяжкіх работах працавалі жанчыны. Жоўтыя прафсаюзы ў дружбе з фабрыкантамі не дапушчалі жанчын да ткацкага станка.

Пасля прыходу Чырвонай Арміі аказалася, што ткачыхі-жанчыны працуюць не горш за мужчын.

19 гадовая работніца 1-га камбіната Цыля Рачыцкая адна з першых перайшла на абслугоўванне двух станкоў. Зараз яна — вопытная ткачыха, якую на прадпрыемстве лічаць адной з лепшых. Яна перайшла на абслугоўванне двух станкоў 7 тыдняў таму назад і цяпер дае ўжо 78 тысяч удараў у дзень.

На плюшавай фабрыцы зараз працуюць 53 ткачыхі. Падрыхтоўваюцца да аўстаночнага абслугоўвання 114 плюшавых станкоў. У скорым часе 7 лепшых ткачых пачнуць на іх працаваць.

Сярод ткачых плюшавай фабрыкі ёсць вельмі здольныя. Добрымі майстрамі паказалі сябе ткачыхі Фрончак і Кандрацкая. Ткачыха тав. Карасіма зараз вылучана інструктарам ткацкага цэха.

Жанчыны-ткачыхі вядуць барацьбу за павышэнне прадукцыйнасці працы. Яны плячо ў плячо з мужчынамі змагаюцца за росквіт сваёй радзімы.

В. Бемаў

НА КІРУЮЧАЙ РАБОЦЕ

За 5 з паловай месяцаў совецкай улады вялікая колькасць жанчын-работніц вылучана на кіруючую работу. Упершыню жанчыны, якія пры капіталізме былі толькі таннай рабочай сілай, атрымалі роўныя з мужчынамі правы.

На гаспадарчай, профсаюзнай, совецкай рабоце, у выбарчых камісіях працуюць жанчыны.

Дырэктарам 25 тэкстыльнай фабрыкі вылучана дэпутат Народнага Сабрання работніца Ж. Каплан. Яна часта бывае ў цэхах, гутарыць з рабочымі, клапоціцца аб іх жыцці. Тав. Каплан вядзе барацьбу з тэхнічнымі цяжкасцямі і непаладкамі на фабрыцы. Калі ў лютым фабрыцы пагражаў прастой з-за адсутнасці паліва, яна выехала ў лес і забяспечыла прадпрыемства палівам. Рабочы калектыў паважае свайго дырэктара.

Старшынёй фабкома 23 тэкстыльнай фабрыкі выбрана работніца А. Сідаровіч. Ужо тры месяцы працуе яна на гэтай рабоце. За гэты час значна палепшыліся ўмовы працы на прадпрыемстве. Пры фабрыцы ёсць сталоўка, дзіцячы сад. А. Сідаровіч карыстаецца аўтарытэтам у рабочых.

Работніца М. Дз'ячук вылучана загадчыкам аддзела скарг Беластоцкага аблвыканкома. Праз яе рукі праходзяць дзесяткі пісем са скаргамі працоўных. Да яе прыходзяць людзі, каб параіцца, расказаць аб сваіх занатрабаваннях. Тав. Дз'ячук уважліва адносіцца да наведвальнікаў, клапоціцца аб скорым разглядзе скарг.

На многіх прадпрыемствах Беластока жанчыны вылучаны на кіруючую работу. Работніца тав. Кнайф вылучана загадчыкам аддзела кадраў першага тэкстыльнага камбіната. Тав. Вчышынская вылучана майстрам вацiннай фабрыкі. тав. Маркоўская — ва ўпраўленне камбіната і многа іншых.

Жанчыны заходніх абласцей Беларусі, вызваленыя з-пад панскага ярма, актыўна ўключыліся ў соцыялістычнае будаўніцтва.

Лірская.

ЗДАБЫТАЕ ПРАВА

Сакавікавы дзень. З прадмесцяў Беластока павеяў цёплы, прадвясенні вецер. З фабрычнага двара на вуліцу нясецца радасны дзіцячы смех. Гэта яслі.

У фабрычных дзіцячых яслях вясёлыя з усмешкай дзеці ў каляровых вопратках гуляюць пад апекай выхавацельніц. Маленькія ляжаць у ложках. Старэйшыя трымаюцца за рукі і харадодам з усёй сур'ёзнасцю, спяваюць песенку аб верабі, які не можа знайсці ежу ў марозны дзень.

Такую-ж песню спявалі калісьці дзеці ў рове над сточнай канавай. У іх былі жоўтыя твары, сінь пад вачыма. Выліняўшыя шматы вопратак спадалі з худых цельцаў. Гэта былі дзеці фабрычных рабочых.

Мінуліся часы безнагляднасці дзяцей рабочых. Для іх адчынены яслі і сады. Зараз у Беластоку ёсць пяць ясляў, у Гродна—2, будуюцца дзіцячыя яслі ў вёсках. Да дня 8 сакавіка адкрываюцца новыя яслі ў Супраслі, Чорнай Весі, Міхалове. Мацеры могуць спакойна працаваць на сваёй рабоце. Іх дзеці даглядаюцца ў дзіцячых яслях і садах.

Вялікае шчасце жыць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, якая не толькі выраўняла правы жанчын з правамі мужчын, прызнаўшы жанчыну поўнапраўнай грамадзянкай нашай вялікай радзімы, але звярнула ёй найвялікшае права, ад якога жанчын пазбавіў капіталізм—права спакойнага радаснага мацярынства.

Е. Сельм

ЖАНЧЫНА ў СССР

(ЛІЧБЫ і ФАКТЫ)

Жанчыны СССР паспяхова авалодваюць авіяцыйнай справай і заваёўваюць міжнародныя рэкорды на самалётах, планерах, парашутах і паветраных шарах. Толькі па самалётах і планерах жанчыны СССР заваявалі 5 міжнародных рэкордаў.

Імёны Валянціны Грызадубавай, Паліны Осіпенка і Марыны Расковай, зрабіўшых бяспрыкладны пералёт з Масквы на Далёкі Усход, вядомы ўсяму свету. Гэта першыя жанчыны, узнагароджаныя высокім званнем Героя Совецкага Саюза.

—о—

На пасадах старшынь, намеснікаў старшынь і членаў праўленняў калгасаў працуе велізарная армія жанчын. За дзесяць год калгаснага ладу выраслі многатысячныя жаночыя кадры брыгадзіраў, аграномаў, заатэхнікаў, звеннявых, трактарыстак.

Зараз дзесяткі тысяч калгасніц абучаюцца кіраваць трактарам. Толькі на Украіне ідзе падрыхтоўка 20 тысяч калгасніц-трактарыстак.

—о—

Жанчын-інжынераў і тэхнікаў да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў краіне амаль зусім не было. Цяпер у СССР толькі па адной буйнай прамысловасці звыш 100 тысяч жанчын інжынерна-тэхнічных работнікаў.

—о—

Звыш 12 тысяч совецкіх жанчын — навуковыя работнікі. Адну трэць аспірантаў навукова - даследчых устаноў складаюць жанчыны.

—о—

Совецкія жанчыны вылучаюць з свайго асяроддзя тысячы таленавітых музыкантаў, артыстак, пісьменніц, мастакоў, скульптараў. Многія з іх узнагароджаны ордэнамі СССР.

—о—

У царскай Расіі было ўсяго 2 тысячы жанчын - урачоў. У СССР у 1936 годзе іх стала ўжо звыш 53 тысяч.

—о—

Толькі ў СССР жанчыне створаны ўсе ўмовы для забяспечанага і шчаслівага мацярынства. Ніdзе ў свеце дзяржава не праяўляе такіх клопатаў аб мацеры і дзіцяці, як у Совецкім Саюзе.

—о—

У СССР ужо ў 1937—38 гг. было амаль 122 тысячы радзільных коек, 3,5 мільёна месц у сезонных і 723 тысячы месц у пастаянных яслях, звыш аднаго мільёна месц у дзіцячых садах, 2, 1 мільёна на дзіцячых пляцоўках, 4700 жаночых і дзіцячых кансультацый, 1659 малочных кухань, 457 дамоў мацеры і дзіцяці.



На здымку: выдатніцы вучобы 2-га курса школы медыцынскіх сясцёр у гор. Карсуні (Кіеўская вобласць) дачка калгасніка сельгасарцелі «Перамога», Карсунскага раёна, комсамолка Х. Л. Яцэнка (злева) і дачка калгасніка арцелі «Заможнік», Вяліка-Палавецкага раёна, комсамолка О. Д. Севірэненка. (Фота-кліша ТАСС).

Рэгіна Каплан.

З нядаўняга мінулага

Далёка за поўнач не спіць маці. Стомлена круціць верацяно, ціха выпрадае нітку. А думкі... доўгія, як нітка, нескончоныя, як кудзеля, цяжкія, як яе праца... Спрадзеш кудзелю, вытчаш палатно. А невядома, можа яшчэ яго забярэ паліцыя за незаплочаныя падаткі? Столькі працы пакладзена. А вось прыдуць і забяруць...

І іншае прыходзіць на думку. Чым пракарміць сям'ю? Студзень на двары, а хлеба свайго ўжо няма. І заработку няма. За адпрацаванае, за тое, што капала бульбу, за тое, што жала пан не плоціць ужо другі год. А хату нечым абаграваць. Пойдзеш у панскі лес галлё збіраць — аштрафуе. Дзеці ў школу не ходзяць — абутку няма.

Ды гэта яшчэ што. Нам дрэнна, а як-жа сынам у турме? Вось у каго двое, а то і трое ды па дзесятку год асуджэння маюць, а то і пажыццёва сядзяць. Ці на тое ў муках на полі радзіла, каб ненавісныя каты рукі збівалі, мучылі і за турэмныя краты кідалі?

І што ім паслаць? Галеча дома такая, і нявольнікам-жа недзе хочацца есці. Тысячы матак хадзілі на паліцэйскія ўчасткі — выглядалі, дзе іх дзеці. Насілі ўрваны ад сябе, ад галоднага свайго пажытку хлеб, кавалак сала ў турму.

Гадзінамі прастойвалі пад турэмнымі варотамі, чакаючы спаткання і, захліпаючыся, крычалі штосьці праз двайныя краты, скрозь густыя слёзы ледзь бачачы сына, мужа.

Але не толькі журыліся.. З жаночага смутку, з сардэчнага болю вырастала вялікая, нястрымная нянавісць да мучыцеляў, да катаў, да ўсіх паноў, нараджалася воля да барацьбы.

І вось рада цяпер яна, 67-гадовая Аўдоцця Глушчук, якая так нядаўна горка прыпявала над калыскамі двух унучкаў, бацькі якіх былі надоўга асуджаны польскім судом. Зусім нядаўна быў схоплен трэці, 19-гадовы сын, за тое, што браты яго сядзелі і што сам выказваў абурэнне. Рада, што разбіты панскія турмы, усе тры сыны вярнуліся дадому. Старэйшы ў міліцыі ў Кобрыне зараз служыць.

З Аўдоццяй разам Агаф'я Бідек да турмы хадзіла, там-жа падружыліся, калі прыёму пасылак чакалі. А потым, калі Чырвоная Армія прыйшла, разам самыя найпрыгожыя вянкі парабілі, яблычкамі ўпрыгожылі і падарылі першаму совецкаму танкісту, які прыйшоў у вёску. У Агаф'і ўсё яшчэ не адступае вялікае матчына гора: у польскай турме памёр сын. Але ўсведамленне перамогі справы, за якую сын змагаўся, надае старой сілы перадолець асабістае гора.

А вось добрая, баявая, палітычная Зося Лавовік. Першая з Замошша секвестратара выгнала. Было ў яе трое дзяцей, а муж у Аргентыне на капальнях. Батрачыла. І з апошняга скарбу дзяліла нам, палітычным, прадала апошнюю авечку, каб купіць хлеба. Цяпер яна з хваляваннем апавядае аб сельскоме, дзе яна членам. А з мінулага шкадуе, што схаваны ад паліцыі сшытак з рэволюцыйнымі песнямі згрызлі мышы.

Ёсць што ўспомніць цяпер сялянкам. О, яны не гнуліся перад злыднямі. Яны змагаліся, яны стаялі за праўду ўсёю сілай сваёй салідарнасці. Гэта яны ў 1933 годзе, у час баявой чатырох з паловай месячнай забастоўкі выгналі з 13 вёсак секвестратараў. Памятаю, сядзела я ў халоднай у вёсцы Бельчыцы. Гаспадыня клапатліва прынесла гарачага вутолля — патрэцца. А тут — хлоп дзвярыма. Цётка, чуеш? — секвестратар прыйшоў. — Схапіла хлебную лапату і айда на вуліцу. З усіх сіл беглі ўсе жанчыны і — секвестратара прагналі.

У Новадворцах жанчыны, калі паліцыя арыштавала іх сыноў, сабраліся ўсе разам, пайшлі на паліцэйскі ўчастак у Руднікі, цэлы бунт наладзілі. Паліцыя спалохалася і выпусціла арыштаваных.

А ў Леплюўцы, як прыехалі паліцэйскія забіраць за падаткі карову, старыя жанчыны ударылі палкамі па грабежніцкіх руках. Прагналі паліцыянтаў. Страляла потым паліцыя. Забіла таварыша Багоньскага. Паднялі цела і са спевам «Інтэрнацыянала» панеслі па вёсцы. А потым прыехала банда паліцэйскіх — 60 чалавек. Катавалі матак, жонак, старых бацькоў, каб выдалі дзяцей, мужоў, якія хаваліся ў лесе і хацелі пачынаць партызанскую барацьбу.

У палітычнай барацьбе многа ўдзельнічала жаночай моладзі, актыўных дзяўчат. Вось Вася Казлова — чорныя, агнявыя вочы на бледным прыгожым твары. Бурная ў яе маладосць, цвёрды характар. Сядзела ў турме за дэманстрацыю ў вёсцы Літвінкі, Кобрынскага павета. Вася ўзняла чырвоны сцяг, і калі народ выходзіў з касцёла, заклікала на дэманстрацыю ў дзень смерці Леніна. Потым два з паловай годы хавалася, нарэшце, арыштавалі.

Цяпер Вася гарыць новым агнём, бурліць радасць, што назаўсёды свабодны чалавек будзе гаспадаром жыцця. Яна загадвае сталовай і ўсюды паспявае: і ў тэатр схадзіць, і з таварышамі пагаварыць. Наперадзе — столькі шчасця!

Падруга-ж яе, Паша Сідарук, з якой у турме разам аб свабодзе ўспаміналі, цяпер у дзіцячых садах працуе. І справа гэта для яе падыходзячая: спакойная яна, уважлівая, працавітая.

Многа, вельмі многа нас, падруг па турэмнаму жыццю. Доўга трэба расказваць, як пад зверскімі здзекамі турэмных катаў мы не забывалі аб свабодзе. Мы трымаліся стойка і горда, каб быць дастойнымі мас, якія змагаліся. Нас, трыста палітзняволеных, завезлі за 30 кілометраў да германскай граніцы. Многа было жанчын з Заходняй Беларусі, з Украіны. У 1937 годзе пачалі ў турме адбіраць уласную вопратку, увялі новыя парадкі, каб прыраўняць нас с крымінальнікамі, адабраць прагулку, газеты, змарыць голадам.

Пачалі з 15-гадовай Пенкі. У 25—30-градусны мароз яе трымалі ў адной бялізне. Забаранілі крымінальнікам, каб давалі чым-небудзь прыкрывацца. Давалі толькі поўпорцыі вадзяністага супу.

А потым раздзелі яшчэ некалькі таварышоў. Сядзелі без вады, у камеры, дзе прыбіральні—душыліся ад смуроду. А калі не здаваліся — прышлі ў мароз, знялі бялізну, аблілі вадой і пакінулі на цэлую ноч мокрымі.

Пасля гэтага ўзяліся за ўсіх. Начальніца турмы садыстка Зданоўская раздзела ўсіх дагала за тое, што не хацелі адзяваць турэмную вопратку. Восем тыдняў палітычныя зняволеныя жанчыны на Фардоне сядзелі зусім голыя, як маці радзіла.

(Працяг на 4-й старонцы)

ПАД ЦЯЖАРАМ БЯСПРАЎЯ І НІШЧАТЫ

Законы, звычаі, умовы жыцця і працы ва ўсім капіталістычным свеце такія, што жанчына там прыніжана і прыдушана. Жанчына, асабліва жанчына-пралетарка і сялянка, за рубяжом пазбаўлена нават тых абмежаваных правоў, якія буржуазныя канстытуцыі прадастаўляюць мужчынам.

У большасці краін Еўропы: ва Францыі, Італіі, Іспаніі, Бельгіі, Швейцарыі, Югаславіі і інш. — жанчыны поўнасцю пазбаўлены выбарчых правоў.

Ва ўсіх капіталістычных краінах у вытворчасці заняты велізарныя масы жанчын. Прадпрыемцы эксплаатуюць іх яшчэ больш бязлітасна, чым мужчын. У Злучаных Штатах Амерыкі жанчына-работніца атрымоўвае няшмогім больш паловы заработнай платы мужчыны, у Англіі — амаль палову, у Японіі — менш трэці.

Умовы жыцця і працы для жанчын у Японіі можна параўнаць толькі з катаржнай турмой. Як правіла, работніцы для тэкстыльных фабрык у гэтай краіне не вярбуюцца добраахвотна, а КУПЛЯЮЦЦА. Голад і нішчата ў японскай вёсцы такія бязлітасныя, што сяляне вымушаны гандляваць сваімі дачкамі. На японскіх тэкстыльных фабрыках рабочы дзень даходзіць да 16 гадзін. Астатні час работніцы праводзяць у бітком набітых фабрычных казармах, пад строгім наглядам, не маючы права выйсці адтуль.

У капіталістычных краінах мільёны беспрацоўных жанчын; яны гадамі шукаюць работу, згаджаючыся на любыя ўмовы. Нядаўна адна ўстанова ў Нью-Йорку (Амерыка) дала ў газетах аб'яву, што ёй патрэбна 12 прыбіральшчыц. На 12 месц з'явілася дзесяць тысяч кандыдатак.

Зусім нядаўна працоўная жанчына заходніх абласцей Украіны і Беларусі знаходзілася пад цяжкім прыгнётам польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Як і ў іншых капіталістычных краінах, заработная плата жанчын - работніц тут была значна ніжэй, чым заработак рабочых-мужчын. У пошуках работы жанчына згаджалася на самую нізкую аплату, каб толькі мець хоць штонебудзь на пракармленне. Жудасная была доля ўкраінскай і беларускай сялянкі, працуючай у кабале ў памешчыкаў і кулакоў. У пошуках работы большасць сялянскіх дзяўчат ішла ў горад, але і там іх чакалі нястача і беспрацоўе. Цяпер працоўныя жанчыны заходніх абласцей Украінскай і Беларускай ССР назаўсёды пазбаўлены ад жахаў мінулага, перанесеных у панскай Польшчы.

Імперыялістычная вайна ў Еўропе нясе з сабой новыя бядоты для народных мас, цяжкія пакуты і лішэнні для працоўных жанчын. Іх мужоў, братоў, сыноў пасылаюць на ўбой, каб абараняць інтарэсы фабрыкантаў і памешчыкаў. А сем'і асуджаны на голад, хваробы, нішчату.

У Англіі і Францыі дзяржаўныя дапамогі сем'ям мабілізаваных настолькі нікчэмныя, што пражыць на іх немысліма. К таму-ж пад рознымі повадамі гэты дапамогі скрозь і ўсюды не выдаюцца. Тое-ж самае адбываецца і ў белай Фінляндыі, дзе банды ката Манергейма здзекваюцца над працоўным фінскім народам, прадаўшы яго інтарэсы англійскім імперыялістам.

Жонка аднаго фінскага салдата расказала карэспандэнту шведскай газеты „Ню даг" наступнае: „Майго мужа ўзялі ў армію. Мяне з дзецьмі эвакуіравалі з горада. Нам выдалі толькі чыгуначныя білеты, астатнія выдаткі на наш кошт. У вёсцы нас пасялілі ў драўлянай прыбудове, якая не ацяплялася. Мы страшэнна мерзлі. Маё малодшае дзіцё захварэла і чуць не памерла. Сем'ям мабілізаваных абяцалі дапамогу, але да гэтага часу мы нічога не атрымалі."

Працоўныя жанчыны зарубежных краін вылучаюць з свайго асяроддзя самаадданых змагароў за народнае права. Усе памятаюць, як мужна змагаліся ў радах іспанскай рэспубліканскай арміі жанчыны, як не шкадавалі яны сіл, працуючы на вытворчасці ў тылу, каб забяспечваць армію усім неабходным. Усе ведаюць, якія ўзоры гераізма паказваюць жанчыны Кітая ў барацьбе з японскімі захватчыкамі.

Мы ведаем, што і нашы перадавыя жанчыны, знаходзячыся ў ціскач польскай паліцэйшчыны, умелі змагацца за свабоду і незалежнасць працоўнага народа. Яны заклікалі рабочых і сялян скінуць панскае іга, скінуць капіталістаў і памешчыкаў.

У краінах Еўропы, якія вядуць зараз імперыялістычную вайну, жанчыны актыўна ўдзельнічаюць у антываенным руху, дабіваючыся спынення злачыннай вайны.

І. Бельская.

ТЭЛЕГРАМЫ

Рух у Англіі супроць дапамогі бела-Фінляндыі

У Англіі шырыцца рух супроць аказання дапамогі белафінам. Гарадскі і акруговы совет профсаюза рабочых джутавай і ільняной прамысловасці ў Дандзі (цэнтр джутавай прамысловасці Шатландыі) прыняў рэзалюцыю, у якой рашуча асуджае пазіцыю органа лейбарыстаў — газеты „Дэйлі геральд", якая падтрымлівае фінскую белагвардзейшчыну і разгарнула кампанію супроць Совецкага Саюза. У рэзалюцыі змяшчаецца патрабаванне, каб генсовет профсаюзаў і выканком лейбарысцкай партыі неадкладна спынілі палітыку супрацоўніцтва з англійскім урадам.

У нізавых арганізацыях лейбарысцкай партыі расце незадавальненне палітыкай сваіх рэакцыйных кіраўнікоў. Актыўны дзеяч лейбарысцкай партыі ў Біркенхедзе (графства Чэшыр) Коултхард заявіў аб сваім выхадзе з лейбарысцкай партыі і намеры ўступіць у комуністычную партыю. Коултхард указаў, што лейбарысцкія кіраўнікі, супрацоўнічаючы з англійскім урадам, падтрымліваюць імперыялістычную вайну, якая прыносіць мільёнам працоўных цяжкія пакуты.

(ТАСС).

НАСТУПЛЕННЕ АНГЛІЙСКІХ КАПІТАЛІСТАЎ НА ПРАВЫ РАБОЧЫХ

Англійскія капіталісты з поўнай згоды і пры прамым падтрыманні рэакцыйных кіраўнікоў англійскіх трэд-юніёнаў (профсаюзаў), урэзваюць правы рабочых, заваяваныя імі ў доўгагадовай барацьбе.

Побач з рэзкім зніжэннем заработнай платы на шматлікіх англійскіх прадпрыемствах самавольна падоўжан рабочы дзень. 2.459 фабрык і заводаў атрымалі афіцыяльны дазвол павялічыць рабочы дзень для жанчын і падросткаў. На 299 прадпрыемствах устаноўлена, двухзменая работа, на 102 прадпрыемствах уведзены начныя змены. У рэзультаце — значна пагоршыліся ўмовы працы соцень тысяч жанчын і моладзі.

Нядаўна англійскія ўлады выдалі новае распараджэнне, якое дае прадпрыемцам права ўстанаўліваць 57-гадзінны рабочы тыдзень для жанчын і падросткаў, тады як фабрычным заканадаўствам максімальны рабочы тыдзень для іх прадугледжваецца ў 44 гадзіны.

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

Берлін, 6 сакавіка. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, германскі атрад атакаваў пасля ўзмоцненай артылерыйскай падрыхтоўкі адзін з непрыяцельскіх пастоў на лініі Мажыно. Праціўнік пакінуў на полі боя каля 20 забітых. Адзін фельдфебель і 16 англійскіх салдат узяты ў палон.

Парыж, 7 сакавіка. (ТАСС). У афіцыяльным камюніке паведамляецца, што ўчора на фронце «не адбылося нічога істотнага. Ноччу на ўсход ад Мозеля была адбіта вылазка праціўніка».

ВАЙНА НА МОРЫ

Па звестках англійскага друку, на працягу тыдня, які закончыўся 3 сакавіка, было патоплена 8 параходаў агульным вадазмяшчэннем у 21.231 тону. З іх страты Англіі і Францыі складаюць тры параходы, страты нейтральных краін — пяць параходаў. Па словах агенцтва Рэйтэр, германскія страты на моры за першыя шэсць месяцаў вайны складаюць 47 параходаў агульным вадазмяшчэннем у 248.000 тон.

(ТАСС).

УВЯДЗЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ НАД ПРАМЫСЛОВАСЦЮ У РУМЫНІІ

У румынскіх газетах апублікаваны закон, згодна якому прамысловая прадукцыя будзе і ў будучым знаходзіцца пад непасрэдным кантролем урада. Ніякае прамысловае прадпрыемства не зможа паменшыць ці спыніць выпуск сваёй прадукцыі, апрача выключных выпадкаў, без згоды міністэрства нацыянальнай эканомікі. Міністэрства працы мае права павялічыць колькасць рабочых гадзін у любым прамысловым прадпрыемстве.

(ТАСС).

ПРАСЛЕДВАННІ КОМПАРТЫІ Ў КАНАДЗЕ

У Вінніпегу (правінцыя Манітоба, Канада) паліцыя ўчыніла налёты на памяшканне компартыі і зрабіла вялікую колькасць арыштаў. Захоплены розныя дакументы, а таксама экземпляры комуністычнай газеты. Арыштаваным, па ўсёй магчымасці, будзе прад'яўлена абвінавачванне ў парушэнні «правіл Канады».

(ТАСС).



На здымку: на перадвыбарчай нарадзе 581-й выбарчай акругі ў Доме партактыва (г. Беласток) па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

(Фота Сапір).

Сход работнікаў мастацтваў

5 сакавіка ў зале гарадскога тэатра адбыўся сход работнікаў мастацтваў гор. Беластока, прысвечаны выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Пад незмаўкаючыя апладысменты сабраўшыяся артысты, мастакі, скульптары, музыканты выбралі ў пачотны прэзідыум членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З вялікай увагай быў выслухан даклад сакратара гаркома партыі тав. Гершмана.

Выступаючыя ў спрэчках выражалі сваю адданасць партыі і ўраду, сваю гатоўнасць актыўна ўдзельнічаць у выбарах.

Слова бярэ кіраўнік Яўрэйскага драматычнага тэатра тав. Марэўскі. З вялікім хваляваннем расказвае ён аб любві і адданасці да вялікага правадыра народаў любімага Сталіна.

„Я ўпэўнен у тым, — гаворыць тав. Марэўскі, — што ўсе работнікі мастацтваў пойдуць да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за верных сыноў народа".

Метадыст Дома народнай творчасці тав. Бубрык расказвае аб актыўным удзеле ў выбарчай кампаніі работнікаў Дома народнай творчасці, аб разгорнутай агітмасавай рабоце, якую яны вядуць сярод выбаршчыкаў.

На трыбуне — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Абрам Гешэлевіч Машэвіцкі.

„Я выйшаў з народа, — гаворыць тав. Машэвіцкі, — і я моцна з народам звязан. Цяпер, калі мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, я тым больш адчуваю гэтую сувязь. Я жадаю прысвяціць усё маё жыццё і энергію выкананню адказных задач, якія пастаўлены перада мной народам".

Сход аднагалосна прыняў зварот да работнікаў мастацтваў, у якім заклікае актыўна ўключыцца ў кампанію па падрыхтоўцы выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, арганізаваць культурнае абслугоўванне выбаршчыкаў.

Пад бурныя апладысменты прынята прывітальная тэлеграма таварышу Сталіну.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

З НЯДАЎНЯГА МІНУЛАГА

(Працяг з 3-яй старонкі).

Спалі на голых дошках. А здзекі... раней выдавалі пасылкі ў камеры, а тады, каб іменна ўдарыць па жаночаму сораму, прымушалі голых ісці за пасылкай праз два паверхі. Раней выдавалі страву ля дзвярэй камеры, а тады, каб сціскаліся зубы ад абурэння, ад сораму, прымушалі кожную асобна ісці з міскай на канец карыдора. Прастудзілася, захварэла таварыш Сіма — з тэмпературай сядзела голая на дошках.

А каб людзі ў турме не маглі вучыцца, каб яны зачахлі, каб думалі толькі аб ядзе — устанавілі прысылаць са свабоды столькі, колькі трэба, каб не галадаць. І калі прыбываў з вёскі хлеб — чорствы, але больш назначанай вагі, — гэты хлеб, які родныя паслалі, адарваўшы ад свайго рота, турэмшчыкі адбіралі.

Нашы 15 і 16-гадовыя палітычныя вязняволеныя сядзелі на ізаляцыі ў адзіночках па некалькі месяцаў, без кніжак, без чалавечага слова. А Здаўноўская ўласнымі рукамі біла, цягала за валасы, за грудзі, за вушы нашых дзяўчатак. Лідзе Сапега абарвала вуха, скалечыла да крыві. І як цяпер былой нашай палітзняволенай Жаве Камерман, якая пайшла ў турму пятнаццаці год і прасядзела чатыры годы, як ёй цяпер, працуючай на тэкстыльнай фабрыцы ў Беластоку, не быць актывісткай!

А 38-гадовая Аленушка Турэк... Родная, не дажыла яна да свабодных дзён. Астаўся ўзгорачак на турэмных могілках на Фардоне. 24 годы было Алене. Сядзела за мопраўскую работу. Худзела, хварэла лёгкімі. Доктар, тоўсты як бык (так мы яго і звалі), вызначыў — сімуляцыя, і Аленцы — пакаранне. А потым аказалася — сухоты ў трэцяй стадыі. Цэлых два тыдні мы прасілі купіць ёй вінаграду, калі ўжо яна нічога есці не магла, каб асвяжыла запёклыя вусны і каб ведала, што помнім. І помню, уночы Шура Ярмашук здаўленым голасам пракрычала — памёрла Алена. Назаўтра крывавай слязой аселі ва ўсіх на грудзях чырвоныя банцікі з чорнымі. І калі ўрываліся ў камеры стражнікі зрываць памяць аб Алене, грозна гучэла: — пратэстуем супроць турэмных умоў, якія вядуць да смерці палітзняволеных, пратэстуем супроць забойства Алены!

Памятным астаўся 1938 год. Не адна сівізна прабілася ў валасах, маршчына на тварах, калі даведаліся самае страшэннае — аб правакатарах, што змеямі ўпаўзлі ў рэволюцыйныя рады, што аддавалі людзей у турму, захаплялі кіраўніцтва, вводзілі з баявога шляху ў тупік.

Былі і радасці. Даведаліся пра Сталінскую Канстытуцыю, пра пераможныя баі з японскім імперыялізмам, пра мацнеючы народны фронт... Многа гэтых думак аб мінулым. І ў кожнай свае, асаблівыя. І бачу чорную, як цыганку, з гарачымі вачыма, Ханку Няпомнячую. Перад ёй — пажыццёвае зняволенне за ўдзел у забойстве правакатараў. Анна Карловіч сем год не бачыла свае дзіця, не мела пісем. А ў Полі іншае: ёй ужо 24 годы, а яна яшчэ не мела дзіця, а сядзець яшчэ аставалася пяць год. І спакойныя карыя вочы яе смуткуюць па мацярынстве: ужо будзе позна, калі пусцяць на волю.

Думалі яшчэ доўгія годы сядзець. Прышоў 1939 год. З радасцю даведаліся пра XVIII з'езд бальшэвіцкай партыі, пра тое, што пабудован соцыялізм. Потым вайна... Знарок нас адвезлі на Фардон, каб загінулі ў час вайны. Каля турмы германскія самалёты бамбардзіравалі мост, будынак турмы трэсся і трэскаўся. Сцяна турэмнага забора разбіта бомбай, а нас зачыненых трымаюць у камерах. Мы патрабуем эвакуацыі — адмова: не. Турэмная начальніца ўцякла. Зразумелі мы, што хоча, каб мы згарэлі жыўём пад бомбамі. І тады — рашыліся. 34 дзвярэй выламалі і вышлі на свабоду. Нашы дарагія 15 і 17-гадовыя дзяўчаткі сядзелі за жалезнымі дзвярыма. Паўтары гадзіны білі гэтыя дзверы — не паддаліся. Нарэшце разбурылі сцяну і праз вузкую дзірку выцягвалі за галовы нашых любімых.

Але гэта не была яшчэ свабода. Фронт. Праз агонь ішлі 450 кіламетраў, дзень і ноч, босыя, без грошай...

Потым сустрэлі першых людзей з зоркамі на шапках. Свае! Чырвоная Армія! Чырвоная Армія прышла вызваляць нас, наш народ. Няхай жыве Чырвоная Армія! Няхай жыве вечная свабода, прынесеная на сцягах крыві працоўных!

Мы — свабодныя!...

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята —23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62, выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны Галоўліта № 296

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.